ЗАЦВЯРДЖАЮ
“___” _____ 2020 г.

Старшыня прадметнай
экзаменацыйнай камісіі

ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫ БІЛЕТ № 0
для ўступнага іспыту па прадмеце “Беларуская літаратура”

1. Значэнне творчасці Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча для беларускай літаратуры. Майстэрства драматурга ў “Пінскай шляхце”. Высмейванне духоўнай абмежаванасці засцянковай шляхты і выкрыццё царскага чыноўніцтва. Тыповасць вобраза Кручкова. Жанравае вызначэнне твора.
2. Літаратурны працэс у Беларусі на сучасным этапе. Паглыбленне агульначалавечага, маральна-філасофскага, гуманістычнага зместу лірыкі, яе грамадзянска-публіцыстычнага і індывідуальна-асобаснага пачатку. Разнастайнасць творчых індывідуальнасцей у сучаснай паэзіі, пошукі і наватарства (на прыкладзе 2–3 аўтараў).

ЗАЦВЯРДЖАЮ
“__” ______ 2020 г.

Старшыня прадметнай
экзаменацыйнай камісіі

ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫ БІЛЕТ № 0
для ўступнага іспыту па прадмеце “Беларуская літаратура”

1. Высмейванне шляхецкай пыхлівасці і духоўнай абмежаванасці, канфлікт новага і старога пакаленняў ў камедыі Янкі Купалы “Паўлінка”. Майстэрства драматурга ў абмалёўцы персанажаў,
   **або**
   Сацыяльна-філасофскі змест і гуманістычны пафас п’есы Янкі Купалы “Раскіданае гняздо”. Жанр, кампазіцыя, развіццё драматычнага канфлікту. Галоўныя героі драмы, матывы іх паводзін. Сімвалічнасць назвы твора.
2. Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці Уладзіміра Караткевіча. Канкрэтна-гістарычная аснова аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха”. Роздум пісьменніка аб лёсе беларускага народа, узаемасувязі розных гістарычных эпох, аб прызначэнні чалавека на зямлі. Вобразы герояў. Асаблівасці кампазіцыі твора.